Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар БДУКМ
_____ Н.У.Карчэўская
1 чэрвеня 2026 г.
Рэгістрацыйны № ВД-626-110 эвуч.

АХОВА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

Вучэбная праграма ўстановы адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны

2026

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта агульнай вышэйшай адукацыі АСВА 6-05-0322-01-2023 па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны, зацверджанага пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 21.08.2023 № 274, вучэбных планаў БДУКМ па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны

СКЛАДАЛЬНІК:

А.Я.Паўлава, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат гістарычных навук, дацэнт

РЭЦЭНЗЕНТЫ:

С.В.Гаўрылава, загадчык філіяла «Музей беларускага кнігадрукавання» навукова-даследчай і асветнай ўстановы культуры «Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік», кандыдат культуралогіі;

І.Р.Томашава, дацэнт кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:

кафедрай гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 8 ад 26.03.2026);

прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 28.05.2026)

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Ахова гісторыка-культурнай спадчыны» займае важнае месца ў прафесійнай падрыхтоўцы студэнтаў спецыяльнасці 6-05-0322-03 «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны». Актуальнасць вучэбнай дысцыпліны вызначаецца спецыфікай прафесійнай дзейнасці супрацоўнікаў музейных і турыстычных устаноў. Гісторыка-культурная спадчына – унікальная па сваёй значнасці з'ява цывілізацыі. У перыяд глабалізацыі асабліва неабходным становіцца захаванне аб'ектаў матэрыяльнай і элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Вывучэнне тэорыі і практыкі аховы гісторыка-культурнай спадчыны, нацыянальнага заканадаўства Рэспублікі Беларусь і нарматыўных актаў, міжнародных прававых актаў садзейнічае фарміраванню ўсебакова развітага спецыяліста ў галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

Прадметам вучэбнай дысцыпліны «Ахова гісторыка-культурнай спадчыны» з'яўляюцца нацыянальныя юрыдычныя і практычныя аспекты аховы гісторыка-культурнай спадчыны, дзейнасць музейных устаноў у вызначаным кірунку, міжнародныя прававыя дакументы па пытаннях аховы культурнай спадчыны, ратыфікаваныя Рэспублікай Беларусь, супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь з ЮНЕСКА. Змест вучэбнай дысцыпліны ахоплівае кола пытанняў, звязаных з веданнем і выкарыстаннем прынцыпаў, метадаў, форм захавання і актуалізацыі асобных відаў і катэгорый матэрыяльнай і нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны ў Рэспубліцы Беларусь.

Асноўная *мэта* вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Ахова гісторыка-культурнай спадчыны» – фарміраванне ў студэнтаў тэарэтычных ведаў і практычных навыкаў у галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь.

Задачы вывучэння вучэбнай дысцыпліны:

– даць студэнтам сістэмныя веды аб метадалогіі фарміравання Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь; вывучэнні, уліку, захаванні і прыстасаванні гісторыка-культурных каштоўнасцей;

– азнаёміць будучых спецыялістаў з заканадаўчай базай Рэспублікі Беларусь, айчыннай і міжнароднай практыкай у галіне аховы гістарычнай і культурнай спадчыны;

– навучыць студэнтаў складаць і весці дакументацыю, звязаную з вывучэннем, улікам, аховай і папулярызацыяй гісторыка-культурнай спадчыны;

– сфарміраваць у студэнтаў адказныя адносіны да аб'ектаў гісторыка-

культурнай спадчыны Беларусі і дзейнасці па яе захаванню.

У адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 6-05-0322-03 «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны» асноўнымі мэтамі прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў выступаюць фарміраванне і развіццё кампетэнцый, заснаваных на гуманітарных ведах, эмацыянальна-каштоўнасным і сацыяльна-творчым вопыце, якія забяспечваюць рашэнне і выкананне грамадзянскіх, сацыяльна-прафесійных, асобасных задач і функцый.

Зместам вучэбнай дысцыпліны «Ахова гісторыка-культурнай спадчыны» прадугледжана фарміраванне наступных кампетэнцый па спецыяльнасці 6-05-0322-03 «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны»:

– Аналізаваць і ацэньваць асноўныя гістарычныя падзеі і працэсы, дасягненні сусветнай і айчыннай культуры, агульныя заканамернасці фарміравання культурнай спадчыны.

– Выдзяляць асноўныя этапы і крыніцы фарміравання культурнай спадчыны Беларусі, комплекс яе характарыстык.

– Валодаць сучаснымі методыкамі вывучэння, актуалізацыі і інтэрпрэтацыі матэрыяльнай і нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

– Выкарыстоўваць сучасныя веды аб культуры і тэндэнцыях яе развіцця ў музейнай і турыстычнай дзейнасці, ахове культурнай спадчыны, навыкі педагагічнага і аратарскага майстэрства ў яе інтэрпрэтацыі.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Ахова гісторыка-культурнай спадчыны» студэнты павінны *ведаць*:

– асноўныя этапы і крыніцы фарміравання гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі;

– гісторыю станаўлення сістэмы аховы гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі;

– асновы дзяржаўнага рэгулявання аховы гісторыка-культурнай спадчыны;

– змест нарматыўных прававых актаў, якія рэгулююць ахову гісторыка-культурнай спадчыны ў Рэспубліцы Беларусь;

– комплекс характарыстык гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі;

– прынцыпы захавання гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі;

– метадалогію фарміравання Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь;

– асноўныя прычыны страты і пагрозы знішчэння гісторыка-культурных каштоўнасцей Беларусі.

умець:

– аналізаваць крыніцы фарміравання гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі;

– даваць характарыстыку гісторыка-культурнай каштоўнасці і абгрунтоўваць яе ўключэнне ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (далей Дзяржспіс);

– вызначаць пагрозы для захавання гісторыка-культурных каштоўнасцей.

Студэнты павінны *валодаць*:

– навыкамі выкарыстання на практыцы тэарэтычных ведаў аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі;

– навыкамі работы з нарматыўнымі прававымі актамі, якія рэгулююць ахову гісторыка-культурнай спадчыны ў Рэспубліцы Беларусь;

– метадалогіяй вызначэння кірункаў і спосабаў захавання гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь.

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Ахова гісторыка-культурнай спадчыны» распрацавана з улікам пастаўленых задач, узгоднена з праграмамі вучэбных дысцыплін «Тэорыя і методыка музейнай справы», «Асновы навукова-фондавай і навукова-даследчай работы музеяў», «Асновы рэстаўрацыі і кансервацыі матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей», «Нарматыўна-прававое забеспячэнне музейнай і турыстычнай дзейнасці», «Тэорыя і гісторыя культуры», «Турыстычны патэнцыял Беларусі», «Тэорыя і практыка экскурсійнай работы» і інш.

Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны «Ахова гісторыка-культурнай спадчыны» выкарыстоўваюцца сучасныя метады навучання і камп'ютэрныя тэхналогіі. У практыку правядзення семінарскіх заняткаў укараняюцца методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

У ходзе адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць асабісты каштоўнасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, які гатовы да актыўнага ўдзелу ў сацыяльна-культурным жыцці краіны.

Асноўнымі формамі выкладання вучэбнай дысцыпліны з'яўляюцца лекцыі і семінарскія заняткі, заданні для самастойнай работы студэнтаў.

Павышэнню эфектыўнасці вывучаемай вучэбнай дысцыпліны, актывізацыі самастойнай работы студэнтаў у накірунку пошуку і выкарыстання ведаў, атрымання самастойнага вопыта вырашэння задач садзейнічаюць такія педагагічныя методыкі і тэхналогіі, як тэхналогіі праблемна-модульнага навучання, тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці,

камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, дыялогі, абмен думкамі і інш.), сітуацыйныя практыкумы і метад кейсаў.

Структураванне зместу вучэбнай дысцыпліны «Ахова гісторыка-культурнай спадчыны» ажыццяўляецца пры дапамозе вылучэння ў ім узбуйненых дыдактычных адзінак (раздзелаў, тэм).

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Ахова гісторыка-культурнай спадчыны» усяго прадугледжана 100 гадзін, з іх 50 – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 30, семінарскія заняткі – 20. Форма правядзення бягучай атэстацыі – вуснае апытанне, тэсціраванне. Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – экзамен.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

Уводзіны

Змест і мэты вучэбнай дысцыпліны «Ахова гісторыка-культурнай спадчыны». Ахова гісторыка-культурнай спадчыны як напрамак культурнай дзейнасці з мэтай збераж эння гісторыка-культурных каштоўнасцей, стварэння ўмоў для іх перадачы наступным пакаленням. Асноўныя дэфініцыі. Станаўленне тэрміна «спадчына» і яго змест. Спадчына ў кантэксце гістарычнай культуры. Вызначэнне паняццяў «помнік гісторыі і культуры», «культурная каштоўнасць», «культурная спадчына», «гісторыка-культурная спадчына» у сучасных нацыянальных і міжнародных прававых актах і навуковай літаратуры.

Сувязь вучэбнай дысцыпліны з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі спецыяльнасці. Формы навучання і кантролю. Агляд літаратуры і крыніц па вучэбнай дысцыпліне.

Раздзел I. Асаблівасці станаўлення і развіцця сістэмы дзяржаўнай аховы гісторыка-культурнай спадчыны

Тэма 1. Ахова культурных каштоўнасцей на беларускіх землях у дасавецкі перыяд

Зараджэнне ў Еўропе цывілізаванага стаўлення да помнікаў мінулага і культурнай спадчыны. Ахова помнікаў гісторыі і культуры на тэрыторыі Беларусі ў перыяд Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі. Імператарскія ўказы (1826, 1848) па зборы сведчанняў аб рэштках старажытнасцяў. Праватворчая дзейнасць Міністэрства ўнутраных спраў Расійскай імперыі па ахове помнікаў гісторыі і культуры ў XIX – пачатку XX стагоддзяў. Указ Мікалая I «Аб назіранні за захаваннем помнікаў старажытнасці» (1848). Праекты закона «Аб ахове помнікаў» (1869). «Праект правілаў захавання гістарычных помнікаў» (1876). Загады і даручэнні аб забароне разбурэнняў і перабудовы аб'ектаў старажытнасці ў XIX – пачатку XX стст. (1877, 1903). Практычныя дзеянні па забеспячэнню аховы царкоўных помнікаў старажытнасці ў XIX – пачатку XX стст.

Навуковыя таварыствы і ахова помнікаў даўніны. Ахова археалагічных аб'ектаў. Дзейнасць Імператарскай археалагічнай камісіі (ІАК). Усерасійскія археалагічныя з'езды і пытанні аховы помнікаў. Рэстаўрацыя і кансервацыя замкаў, храмаў. Дзейнасць П.П.Пакрышкіна. Археалагічныя раскопкі на тэрыторыі Беларусі (Е.Р.Раманаў, Г.Х.Татур, Я.Тышкевіч, А.Кіркор, В.А.Шукевіч і інш.). Археалагічныя карты Віленскай і Гродзенскай губерняў (Ф.В.Пакроўскі). Дзейнасць грамадскіх арганізацый па вывучэнні,

сістэматызацыіі ахове помнікаў гісторыі і культуры.

Тэма 2. Ахова культурных каштоўнасцей у БССР і СССР

Фарміраванне дзяржаўных органаў па ўліку і ахове помнікаў у першыя гады савецкай улады. Закон «Аб забароне вывазу і гандлю за мяжой прадметамі мастацкага і гістарычнага значэння» (1918). Дэкрэт «Аб рэгістрацыі, прыёме на ўлік і ахове помнікаў мастацтва і старажытнасцей, якія знаходзяцца ва ўласнасці прыватных асоб, таварыстваў і ўстаноў» (1918). Стварэнне губернскіх камітэтаў па справах музеяў і ахове помнікаў мастацтва, старажытнасцей, народнага побыту і прыроды (1918).

Вывучэнне ў БССР помнікаў гісторыі і культуры ў міжваенны час. Дзейнасць Наркомасветы па пытаннях збора і аховы рухомых помнікаў гісторыі і мастацтва. Дзейнасць Інстытута беларускай культуры Акадэміі навук БССР. Вывучэнне культурнай спадчыны ў Заходняй Беларусі. Дзейнасць Міністэрства веравызнання і народнай асветы. Дзейнасць рэстаўрацыйных акругоў і камісій. Інвентарызацыя і рэстаўрацыя помнікаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Другі з'езд рэстаўратараў Польшчы (1927). Закон аб апецы над помнікамі (1928). Улік і ахова помнікаў даўніны XVI–XVIII стст.

Дзяржаўная сістэма аховы гісторыка-культурнай спадчыны ў БССР у пасляваенны перыяд і 1950–1991 гг. Дзейнасць Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. Закон БССР «Об охране памятников культуры» (1969). Закон БССР «Об охране и использовании памятников истории и культуры» (1978).

Тэма 3. Заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны (канец XX – пачатак XXI стст.)

Заканадаўчыя і нарматыўныя прававыя акты, якія рэгулююць ахову гісторыка-культурнай спадчыны. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь (1994 года са зменамі і дапаўненнямі, прынятымі на рэспубліканскіх рэферэндумах 1996, 2004 і 2022 г.). Указы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Закон «Об охране историко-культурного наследия» (1992). Закон «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны» (2006). Законы «О Национальном архивном фонде и архивах в Республике Беларусь» (1994), «О библиотечном деле» (1995), «О музеях и музейном фонде» (1996), «Об архивном деле и делопроизводстве в Республике Беларусь» (2011). Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры (2016). Міжнародныя дагаворы, ратыфікаваныя Рэспублікай Беларусь (Дэкларацыі, Канвенцыі, Рэкамендацыі, Хартыі). Пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. Пастановы і загады Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

Нарматыўныя прававыя акты рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання.

Рашэнні органаў мясцовага кіравання і самакіравання, якія рэгулююць пытанні аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

Тэма 4. Парушэнне заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны

Асноўныя парушэнні заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Невыкананне абавязкаў па падпісанні і (або) невыкананні патрабаванняў ахоўных абавязацельстваў. Парушэнне парадку і (або) умоў выканання работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях альбо здзяйсненне дзеянняў, якія ствараюць пагрозу гісторыка-культурным каштоўнасцям. Парушэнне рэжымаў утрымання і (або) выкарыстання зон аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Незаконнае карыстанне знакамі, ахоўваемымі міжнароднымі дамовамі. Невяртанне на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь гісторыка-культурных каштоўнасцеў. Незаконны пошук, прысваенне і абарот археалагічных аб'ектаў і артэфактаў. Знішчэнне, пашкоджанне або страта гісторыка-культурных каштоўнасцеў або культурных каштоўнасцеў, якім можа быць нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці. Парушэнне парадку вайсковых пахаванняў альбо правядзення пошукавых работ. Здзек над гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі.

Раздзел II. Дзяржаўная палітыка і дзяржаўнае кіраванне ў сферы культуры і аховы гісторыка-культурнай спадчыны

Тэма 5. Дзяржаўнае кіраванне ў сферы культуры

Паўнамоцтвы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у сферы культуры. Паўнамоцтвы Савета Міністраў і Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Кампетэнцыі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, іншых дзяржаўных органаў у сферы культуры. Дзяржаўная палітыка ў сферы культуры: асноўныя напрамкі. Узаемадзеянне ў сферы культуры дзяржаўных органаў з органамі тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, грамадскімі аб'яднаннямі і іншымі юрыдычнымі асобамі, грамадзянамі, у тым ліку індывідуальнымі прадпрымальнікамі. Крыніцы фінансавання ў сферы культуры. Сродкі рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў. Фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва. Асаблівасці фінансавання дзяржаўных арганізацый культуры. Матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне ў сферы культуры.

Тэма 6. Напрамкі дзяржаўнай палітыкі ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны

Прынцыпы і падыходы да аховы гістарычнай і культурнай спадчыны ў Рэспубліцы Беларусь. Органы кіравання Рэспублікі Беларусь, адказныя за ахову гістарычнай і культурнай спадчыны. Формы аховы гістарычнай і культурнай спадчыны ў Рэспубліцы Беларусь. Фінансаванне работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях.

Дзяржаўныя праграмы «Замкі Беларусі», «Культура Беларусі», «Культурная прастора», накіраваныя на захаванне, развіццё, распаўсюджванне і (або) папулярызацыю гістарычнай і культурнай спадчыны. Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 25.07.2016 № 289 «О порядке формирования, финансирования, выполнения и оценки эффективности реализации государственных программ».

Навукова-метадычнае забяспячэнне ўліку, захавання, аднаўлення, утрымання і выкарыстання гісторыка-культурных каштоўнасцей. Беларуская рэспубліканская навукова-метадычная рада па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны і саветы па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны. Асноўныя задачы і кірункі дзейнасці Рады. Склад Рады.

Абласныя і Мінскі гарадскі саветы (далей саветы) па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны). Склад саветаў. Роля саветаў у садзейнічанні ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Грамадскія назіральныя камісіі па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і іншыя кансультатыўныя органы (экспертныя фарміраванні) па пытаннях культуры.

Тэма 7. Прававыя асновы міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны

Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры як прававая аснова міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы культуры. Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 21 лістапада 2017г. № 877 «О сотрудничестве с международными организациями и межгосударственными образованиями» (рэд. ад 19.11.2020 г.).

Міжнародная сістэма аховы культурных каштоўнасцей. Фарміраванне міжнароднага заканадаўства ў галіне аховы культурнай спадчыны. Пакт Рэрыха (Вашынгтон,1935). Дзейнасць ЮНЕСКА па захаванню Сусветнай культурнай спадчыны. Канвенцыя аб абароне культурных каштоўнасцей у выпадку ўзброенага канфлікту (Гаага, 1954). Канвенцыя аб ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны (Парыж, 1972). Канвенцыя аб ахове падводнай культурнай спадчыны (2001 г.). Міжнародная Канвенцыя аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны (Парыж, 2003). Міжнародная рада па

захаванні помнікаў і славутых мясцін (ІКОМАС, 1965). Міжнародная хартыя па кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў і славутых мясцін (Венецыя, 1964). Еўрапейская Канвенцыя аб ахове археалагічнай спадчыны (Лондан, 1969). Хартыя захавання гістарычных гарадоў і гарадскіх абшараў «Вашынгтонская хартыя» (Вашынгтон, 1987).

Раздзел ІІІ. Дзяржаўны ўлік і ахова гісторыка-культурнай спадчыны

Тэма 8. Віды гісторыка-культурных каштоўнасцей

Вызначэнне і суадносіны паняццяў «гісторыка-культурная спадчына», «гісторыка-культурная каштоўнасць», «помнік гісторыі і культуры». Класіфікацыя гісторыка-культурных каштоўнасцей: матэрыяльныя і нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці. Віды матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Помнікі археалогіі. Помнікі архітэктуры. Помнікі гісторыі. Помнікі горадабудаўніцтва. Помнікі мастацтва. Дакументальныя помнікі. Запаветныя мясціны. Нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці. Катэгорыі матэрыяльных і нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Падставы для прыняцця Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычная радай па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны рашэння аб неабходнасці аднясення гісторыка-культурных каштоўнасцей да пэўных катэгорый.

Тэма 9. Вылучэнне культурнай каштоўнасці для надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці

Вылучэнне культурнай каштоўнасці з ліку існуючых альбо выяўленых (прафесійна ці выпадкова). Прафесійнае выяўленне культурных каштоўнасцей, у тым ліку пры правядзенні археалагічных даследаванняў. Дзейнасць юрыдычнай асобы або грамадзяніна, якія выпадкова выявілі матэрыяльную каштоўнасць, якой можа быць нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці. Забяспячэнне мер па ахове выяўленай рухомай і нерухомай матэрыяльнай культурнай каштоўнасці.

Падрыхтоўка абгрунтавання для надання культурнай каштоўнасці статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці. Накіраванне прапановы ў Абласны выканаўчы камітэт, Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт. Дзеянні мясцовага выканаўчага і распарадчага органа базавага тэрытарыяльнага ўзроўню пры прафесійным альбо выпадковым выяўленні культурнай каштоўнасці, якой можа быць нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці. Выплата ўзнагароджання за выпадкова выяўленую культурную каштоўнасць, якая з'яўляецца скарбам і якой нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Тэма 10. Наданне і пазбаўленне статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь

Парадак унясення прапаноў аб наданні культурным каштоўнасцям статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці. Фіксацыя, навуковая апрацоўка і мастацкая ацэнка культурных каштоўнасцей. Крытэрыі для надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці. Наданне культурнай каштоўнасці статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці. Наступствы надання (ненадання) культурнай каштоўнасці статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Пазбаўленне матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці. Алгарытм разгляду прапаноў аб пазбаўленні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці помнікаў архітэктуры. Навуковае заключэнне аб немагчымасці навукова-абгрунтаванага аднаўлення. Прыняцце рашэння саветам па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны. Разгляд пытання аб пазбаўленні статуса гісторыка-культурнай каштоўнасці Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай радай па пытанням гісторыка-культурнай спадчыны. Рашэнне Міністэрства культуры. Асаблівасці пазбаўлення статусу помнікаў археалогіі.

Тэма 11. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Спісы сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны ЮНЕСКА

Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (Дзяржспіс). Парадак уключэння культурных каштоўнасцей, якім нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці ў Дзяржспіс. Асаблівасці ўключэннія комплексу або ансамбля матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей у Дзяржспіс. Структура Дзяржспісу. Звесткі Дзяржспісу. Змяненне звестак аб гісторыка-культурнай каштоўнасці, унесенай у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Актуалізацыя звестак аб гісторыка-культурных каштоўнасцях. Сайт: gosspisok.gov.by.

Уключэнне гісторыка-культурных каштоўнасцей у Спіс сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны ЮНЕСКА, Рэпрэзентатыўны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва, Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якая находзіцца пад пагрозай, або ў іншыя спісы ў адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь. Падрыхтоўка прапаноў аб уключэнні гісторыка-культурнай каштоўнасці ў пералік каштоўнасцей культурнай і прыроднай спадчыны, размешчаных на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, якія могуць быць уключаны ў Спіс сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны. Беларускія аб'екты, абрады, звычаі, святы і рамёствы

ў Спісах сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

Тэма 12. Уліковыя дакументы і Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь

Пашпарт матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці. Ліст змяненняў да пашпарта матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці. Звесткі, якія ўносяцца ў пашпарт матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці лістом змяненняў. Метадычныя рэкамендацыі па запаўненні пашпартоў матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей і афармленню лістоў змяненняў: ліст Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь 29 мая 2023 г. № 04-10 / 4606.

Ахоўныя абавязацельствы. Форма ахоўнага абавязацельства, ўстаноўленая пастановай Міністэрства культуры ад 28 снежня 2016 г. № 90. Правы, абавязкі і абмежаванні праў уласніка (карыстальніка) матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Дзейнасць мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў базавага тэрытарыяльнага ўзроўню ў выпадку змянення звестак аб гісторыка-культурных каштоўнасцях. Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь. Парадак фарміравання, вядзення і выкарыстання Банка звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь.

Раздзел IV. Дзяржаўная ахова гісторыка-культурнай спадчыны

Тэма 13. Захаванне гісторыка-культурных каштоўнасцей

Сістэма арганізацыйных, прававых, эканамічных, матэрыяльна-тэхнічных, навуковых, інфармацыйных і (або) іншых мер, якія ажыццяўляюцца ў мэтах зберажэння гісторыка-культурнай спадчыны. Роля Дзяржаўных праграм у забеспячэнні аховы аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны ў Рэспубліцы Беларусь. Устанаўленне рэжыма спецыяльнага кіравання згодна з міжнароднымі абавязацельствамі Рэспублікі Беларусь для гісторыка-культурных каштоўнасцей, якія ўключаны ў Спіс сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны або Спіс сусветнай спадчыны, якая знаходзіцца пад пагрозай.

Забеспячэнне захавання нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Перамяшчэнне нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці ў мэтах яе аднаўлення. Агляды нерухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей. Складанне актаў агляду. Ахоўная дошка. Форма ахоўнай дошкі. Усталяванне ахоўнай дошкі. Забеспячэнне захавання рухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Забеспячэнне захавання нематэрыяльных гісторыка-культурных

каштоўнасцей.

Дзейнасць музеяў у галіне захавання гісторыка-культурнай спадчыны: арганізацыя работы па захаванні музейных прадметаў і калекцый. Музеефікацыя як спосаб захавання аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны. Рэстаўрацыя аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны ў Рэспубліцы Беларусь.

Ахова гістарычнай і культурнай спадчыны ва ўмовах надзвычайных сітуацый.

Тэма 14. Ахоўныя зоны

Праекты зон аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Парадак распрацоўкі і актуалізацыі горадабудаўнічай і землеўпарадкавальнай дакументацыі, а таксама іншай праектнай дакументацыі, рэалізацыя якой можа аказаць уздзеянне на нерухомыя матэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці. Тэхнічныя нарматыўныя прававыя акты. Зоны аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Ахоўная зона. Зона рэгулявання забудовы. Зона аховы ландшафту. Зона аховы культурнага пласта (слоя). Рэжымы утрымання і выкарыстання зон аховы. Гісторыка-архітэктурны апорны план. Схема ландшафтнага аналізу. Схема межаў зон аховы гісторыка-культурнай каштоўнасці. Прадухіленне пагрозы захаванню матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Недапушчэнне пагаршэння ўмоў успрымання нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей.

Тэма 15. Права ўласнасці на гісторыка-культурныя каштоўнасці і віды работ, якія выконваюцца на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях

Прававое рэгуляванне пытанняў уласнасці на гісторыка-культурныя каштоўнасці. Правы ўласніка матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці. Правы ўласніка калекцыі. Абавязкі ўласніка (карыстальніка) матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці, землекарыстальніка, на зямельным участку якога размешчана нерухомая матэрыяльная гісторыка-культурная каштоўнасць. Адміністрацыйныя працэдуры ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны, якія ажыццяўляюцца Міністэрствам культуры па заявах грамадзян, юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў.

Навукова-даследчыя, праектныя і рамонтна-рэстаўрацыйныя работы. Археалагічныя, архіўна-бібліяграфічныя і натурныя даследаванні. Рамонтна-рэстаўрацыйныя работы: аднаўленне, дапаўненне, кансервацыя,

прыстасаванне, перамяшчэнне, рамонт, раскрыццё, рэгенерацыя, рэканструкцыя. Асноўныя прынцыпы рэстаўрацыі. Асаблівасці рэстаўрацыі рухомых і нерухомых аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны ў Рэспубліцы Беларусь. Методыка рэстаўрацыйных работ.

Дазвол на выкананне навукова-даследчых і праектных работ. Выкананне работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях. Кіраўніцтва распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях. Навукова-метадычнае кіраўніцтва і аўтарскі нагляд. Прыняцце ў эксплуатацыю нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці, на якой выконваліся рамонтна-рэстаўрацыйныя работы. Выкарыстанне матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей.

Тэма 16. Дакументальныя помнікі. Формы і метады іх захавання

Вызначэнне дакументальнай спадчыны. Віды дакументальных помнікаў: акты дзяржаўных органаў, пісьмовыя, графічныя і аўдыявізуальныя дакументы, старажытныя і іншыя рукапісы, рэдкія друкаваня выданні. Архіўныя дакументы і іх юрыдычны статус. Нацыянальны архўны фонд. Роля дзяржаўнай установы «Нацыянальная бібліятэка Беларусі» у захаванні кніжных помнікаў. Дзяржаўны рэестр кніжных помнікаў Рэспублікі Беларусь. Уласнасць на кніжныя помнікі. Асаблівасці захавання і выкарыстання дакументаў, якія залічаны ў культурна-гістарычны фонд Дзяржаўнага фонду каштоўных металаў і каштоўных камянеў Рэспублікі Беларусь. Праграма ЮНЕСКА «Памяць» (1992). Цэнтр камплектавання і вывучэння дакументальнай спадчыны беларускага замежжа (2014). Формы і метады захавання дакументальнай спадчыны. Праблема фізічнага захавання рукапісных помнікаў. Кансервацыя (стабілізацыя) і рэстаўрацыя дакументальных помнікаў. Мікрафільмаванне. Мікрафішаванне. Факсімільнае ўзнаўленне арыгіналаў. Новыя тэхналогіі ў захаванні дакументальных помнікаў. Праблема захаванасці і забеспячэнне доступу да помнікаў.

Тэма 17. Ахова помнікаў археалогіі

Паняцце археалагічнай спадчыны. Археалагічныя аб'екты і артэфакты. Помнікі археалогіі ў Дзяржспісе. Улік археалагічных аб'ектаў і археалагічных артэфактаў. Рэестр археалагічных аб'ектаў. Рэестр археалагічных артэфактаў. Археалагічныя даследаванні. Археалагічныя палявыя работы: археалагічныя раскопкі, разведка, нагляд. Пошук і выяўленне археалагічных аб'ектаў і (або) археалагічных артэфактаў.

Дазвол на права правядзення археалагічных даследаванняў. Камісіі па

археалагічных аб'ектах і археалагічных артэфактах. Выкананне земляных, будаўнічых, меліярацыйных і іншых работ, ажыццяўленне іншай дзейнасці на тэрыторыі археалагічных аб'ектаў. Меры па ахове археалагічных аб'ектаў пры выкананні работ на тэрыторыі археалагічных аб'ектаў. Адміністрацыйныя працэдуры ў сферы аховы археалагічнай спадчыны, якія ажыццяўляюцца Нацыянальнай Акадэміяй навук Беларусі і мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі па заявах грамадзян, юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў. Краснасельскія шахты па здабычы крэменю. Археалагічны комплекс на р. Менцы.

Музеефікацыя археалагічных аб'ектаў: Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей, археалагічны музей «Бярэсце» (1982), археалагічны музей «Верхні горад» у г.Мінску (2012), Тураўскае замчышча (2017), археалагічны музей-скансен у Белавежскай пушчы на месцы археалагічнай стаянкі Камянюкі-1 (2018). Археалагічная навукова-музейная экспазіцыя Інстытута гісторыі НАН Беларусі (2007).

Тэма 18. Ахова помнікаў архітэктуры і горадабудаўніцтва

Паняцце архітэктурнай спадчыны, яе віды. Помнікі архітэктуры ў Дзяржспісе і іншыя помнікі архітэктуры. Захаванне і прыстасаванне помнікаў грамадзянскай архітэктуры. Навукова-адукацыйныя, тэатральна-відовішчныя збудаванні, паштовыя станцыі, вакзалы, гандлёвыя рады, рэстараны, гасцініцы, жылыя будынкі як асобная катэгорыя грамадзянскай архітэктуры. Асаблівасці іх захавання. Ахова помнікаў прамысловай архітэктуры. Вадзяныя і ветраныя млыны. Помнікі гідратэхнічнага і дарожнага будаўніцтва. Будынкі мануфактур, фабрык, заводаў. Захаванне помнікаў абарончай архітэктуры.

Пастанова Савета Міністраў БССР аб стварэнні Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту (1976). Структура музея. Праблемы фарміравання музеяў пад адкрытым небам. Формы захавання і прыстасавання помнікаў драўлянага дойлідства. Рэстаўрацыя дрэва. Метады кансервацыі дрэва. «Археалагічнае дрэва».

Гістарычныя цэнтры гарадоў і гарадскія гістарычныя прадмесці. Помнікі горадабудаўніцтва як комплексы гісторыка-культурных каштоўнасцей. Даследаванне планіровачнай структуры забудовы або фрагментаў планіровачнай структуры забудовы гарадоў. Музеефікацыя архітэктурнай спадчыны. Музеефікацыя палацава-паркавых і сядзібна-паркавых комплексаў Рэспублікі Беларусь .

Музеі-запаведнікі як актуальная форма захавання і выкарытання гісторыка-культурнай спадчыны. Гісторыка-культурны музей-запаведнік

«Заслаўе», Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж», Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік.

Малыя гарады як крыніца і захавальніца гістарычнай і культурнай спадчыны. Мястэчкі Беларусі і спецыфічныя асаблівасці іх планіроўкі. Захаванне прынцыпаў развіцця і рэгіянальнай спецыфікі мястэчак. Дзяржаўнае рэгуляванне архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь.

Тэма 19. Ахова помнікаў гісторыі

Помнікі гісторыі. Помнікі гісторыі ў Дзяржспісе. Мемарыяльныя кватэры. Музеі, прысвечаныя гістарычным падзеям і асобам. Мемарыяльныя ансамблі. Мемарыяльныя дошкі. Мемарыяльныя помнікі гістарычным асобам і падзеям як месцы памяці. Метады вылучэння і выкарыстання гістарычных аб'ектаў. Праблемы захавання помнікаў гісторыі.

Аб'екты ваеннай гісторыі ў Дзяржаўным спісе. Пытанне аб статусе ваенных пахаванняў як гісторыка-культурных каштоўнасцей. Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб ушанаванні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў». Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 24 сакавіка 2016 г. № 109 «Аб ушанаванні памяці аб загінуўшых пры абароне Айчыны і захаванні памяці аб ахвярах вайны». Мэты і задачы ўшанавання памяці загінуўшых абаронцаў Айчыны. Асноўныя формы ўшанавання памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў. Парадак дзяржаўнага ўліку вайсковых пахаванняў (пашпартызацыя). Рэгістр воінскіх пахаванняў і пахаванняў ахвяр войнаў Рэспублікі Беларусь. Аўтаматызаваны банк дадзеных «Кніга памяці Рэспублікі Беларусь». Мемарыяльныя комплексы. Надмагільныя помнікі. Хроніка «Памяць».

Тэма 20. Ахова помнікаў мастацтва

Помнікі мастацтва. Выяўленне, улік і ахова помнікаў выяўленчага і прыкладнога мастацтва Беларусі XIV – XVIII стст. Помнікі мастацтваў у Дзяржспісе. Асаблівасці захавання помнікаў мастацтва: творы выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога і іншых відаў мастацтва. Умовы захавання помнікаў мастацтва ў дзяржаўных музеях Рэспублікі Беларусь. Тэмпературна-вільготнасны, светлавы і ахоўны рэжымы ў фондах і выставачных залах музеяў.

Асноўныя прынцыпы навуковай рэстаўрацыі і кансервацыі. Дзейнасць рэстаўратараў. Рэспубліканскі рэстаўрацыйны савет. Асаблівасці рэстаўрацыі алейнага жывапісу. Рэстаўрацыя тэмпернага жывапісу. Рэстаўрацыя абразоў. Асаблівасці рэстаўрацыі скульптуры. Рэстаўрацыя дэкаратыўных тканін і

скуры. Складанасці рэстаўрацыі гістарычных габеленаў (шпалераў). Рэстаўрацыя антыкварнай мэблі. Умовы захавання твораў мастацтва ў музеях Рэспублікі Беларусь.

Тэма 21. Ахова нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі

Нематэрыяльная культурная спадчына. Канвенцыя ЮНЭСКА «Аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны» (2003). Механізмы дзяржаўнага кіравання працэсамі аховы нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны. Інвентарызацыя нематэрыяльнай культурнай спадчыны: патрабаванні Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры і Канвенцыі 2003 г. Роля Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь у захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Нацыянальны інвентар нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі. Элементы нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі ў Рэпрэзентатыўным спісе нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва. Дзейнасць музейных устаноў Беларусі па захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

Тэма 22. Увоз і (або) вываз, вяртанне культурных каштоўнасцей

Кантроль перамяшчэння культурных каштоўнасцей. Увоз і (або) вываз, вяртанне культурных каштоўнасцей. Адпаведнасць дзеянняў па перамяшчэнні культурных каштоўнасцей Кодэксу аб культуры Рэспублікі Беларусь і іншым актам заканадаўства аб культуры, заканадаўству аб знешнеэканамічнай дзейнасці, заканадаўству аб мытным рэгуляванні, міжнародным дагаворам. Канвенцыя аб мерах, накіраваных на забарону і папярэджанне незаконнага ўвозу і перадачы правоў уласнасці на культурныя каштоўнасці (1972).

Асноўныя падыходы ў культурнай палітыцы Рэспублікі Беларусь па вяртанню культурнай спадчыны. Палажэнні аб рэстытуцыі культурных каштоўнасцей Беларусі ў Кодэксе аб культуры Рэспублікі Беларусь. Кірункі выяўлення культурнай спадчыны Беларусі за межамі краіны. Камісія па выяўленні, вяртанні, сумесным выкарыстанні і ўвядзенні ў навуковы і культурны абарот культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь. Канцэпцыя выяўлення, апісання, уліку і выкарыстання дакументаў па гісторыі і культуры Беларусі, якія захоўваюцца за мяжой.

Асноўныя напрамкі і формы дзейнасці па выяўленні, вяртанні, сумесным выкарыстанні і ўвядзенні ў навуковы і культурны ўжытак культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь. Сайт «Вяртанне»: viartanne.by. Супрацоўніцтва ў рамках ЕАЭС, Саюзнай дзяржавы, СНД па пытаннях перамяшчэння і аховы культурных каштоўнасцей.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

№ раздзела, тэмы	Назвы раздзелаў, тэмы	Колькасць аўдыторных адзін		Колькасць гадзін КСР	Форма кантролю ведаў
		лекцыі	семінарскія. заняткі		
1	2	3	4	5	6
	Уводзіны	0,5			
I.	**Раздзел I. Асаблівасці станаўлення і развіцця сістэмы дзяржаўнай аховы гісторыка-культурнай спадчыны**				
1.	**Тэма 1**. Ахова культурных каштоўнасцей на беларускіх землях у дасавецкі перыяд	1,5		1	падрыхтоўка рэфератаў
2.	**Тэма 2.** Ахова культурных каштоўнасцей у БССР і СССР		2		
3.	**Тэма 3.** Заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны (канец XX – пач. XXI ст.)	2			
4.	**Тэма 4.** Парушэнне заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны			1	падрыхтоўка рэфератаў
II.	**Раздзел II. Дзяржаўная палітыка і дзяржаўнае кіраванне ў сферы культуры і аховы гісторыка-культурнай спадчыны**				
5.	**Тэма 5.** Дзяржаўнае кіраванне ў сферы культуры	1	1		
6.	**Тэма 6.** Напрамкі дзяржаўнай палітыкі ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны	2	1		
7.	**Тэма 7.** Прававыя асновы міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны	2		1	падрыхтоўка прэзентацый і рэфэратаў
III	**Раздзел III. Дзяржаўны ўлік і ахова гісторыка-культурнай спадчыны**				
8.	**Тэма 8**. Віды гісторыка-культурных каштоўнасцей	2			
9.	**Тэма 9** Вылучэнне культурнай каштоўнасці для надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці	1		2	пісьмовая работа
10.	**Тэма 10.** Наданне і пазбаўленне статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь		2		

1	2	3	4	5	6
11.	**Тэма 11.** Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Спісы сусветнай і культурнай спадчыны ЮНЕСКА	1	2	1	вуснае апытанне, падрыхтоўка прэзентацый
12.	**Тэма 12.** Уліковыя дакументы і Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь	1	1		
IV.	**Раздзел IV. Дзяржаўная ахова гісторыка-культурнай спадчыны**				
13.	**Тэма 13.** Захаванне гісторыка-культурных каштоўнасцей		1		
14.	**Тэма 14.** Ахоўныя зоны	1	1		
15.	**Тэма 15.** Права ўласнасці на культурныя каштоўнасці і віды работ, якія выконваюцца на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях	1		2	тэставае заданне
16.	**Тэма 16.** Дакументальныя помнікі. Формы і метады іх захавання	1			
17.	**Тэма 17.** Ахова помнікаў археалогіі	2			
18.	**Тэма 18.** Ахова помнікаў архітэктуры і горадабудаўніцтва	2	1		
19.	**Тэма 19.** Ахова помнікаў гісторыі	1	2	1	выбарачнае апытанне, падрыхтоўка прэзентацый
20.	**Тэма 20**. Ахова помнікаў мастацтва	1			
21.	**Тэма 21.** Ахова нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі	1		1	падрыхтоўка рэфэратаў
22.	**Тэма 22.** Увоз і (або) вываз, вяртанне культурных каштоўнасцей		2		
	Разам	**24**	**16**	**10**	

ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

Літаратура

Асноўная літаратура

1.Кулемзин, А. М. Историко-культурное наследие и общество: теория и методика охраны памятников : учебное пособие / А. М. Кулемзин. – Кемерово: Кемеров. гос. ин-т культуры, 2018. – 147 с. – URL: https://znanium.com /catalog/ product/ 1041180 (дата обращения:30.01.2026).

2.Самусік, А. Ф. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі : вучэбны дапаможнік / А. Ф. Самусік . – Мінск : Экаперспектыва, 2013. – 367 с.

3.Сидорова, С. О. Историко-культурное наследие Беларуси : учебное пособие / С. О. Сидорова. – Минск : БГУФК, 2023. – 131 с. - URL: https://e.lanbook.com /book/483437 (дата обращения:22.04.2026).

Дадатковая літаратура

1.Баринова, Е. Б. Организация работы по хранению музейных предметов и коллекций : учебник и практикум для вузов / Е. Б. Баринова. – Москва : Юрайт, 2022. – 88 с.

2.Богуславский, М. М. Культурные ценности в международном обороте: правовые аспекты / М. М. Богуславский. – 2-е изд., перераб. и доп. – Москва : ИНФРА-М, 2018. – 416 с. - URL: https://znanium.com /catalog/ product/ 968676 (дата обращения:30.01.2026).

3.Кимеева, Т. И. Комплектование, учет и хранение музейных фондов : учебное пособие / Т. И. Кимеева. – Кемерово : КемГИК, 2022. – 139 с.

4.Несцярчук, Л. М. Ахова гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі: асноўныя этапы фарміравання, сучасны стан і перспектывы / Л. М. Несцярук. – Мінск : БелТА, 2003. – 286 с.

Крыніцы

1. Конституция Республики Беларусь : с изм. и доп., принятыми на респ. референдумах 24 нояб. 1996 г., 17 окт. 2004 г. и 27 февр. 2022 г. – Минск : Нац. центр законодательства и правовой информ. Респ. Беларусь, 2025. – 77 с

2. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры : па стане на 6 лют. 2023 г. – Мінск : Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі Республікі Беларусь, 2023. – 280 с.

Характарыстыка рэкамендаваных педагагічных тэхналогій і метадаў выкладання

Пры арганізацыі выкладання вучэбнай дысцыпліны «Ахова гісторыка-культурнай спадчыны» рэкамендуецца выкарыстоўваць традыцыйныя формы і метады навучання: лекцыйныя і семінарскія заняткі, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы. У практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя метады (групавыя дыскусіі, мадэліраванне практычных сітуацый і інш.), візуальныя метады (метады ілюстрацыі, дэманстрацыі, відэаматэрыял).

У ліку эфектыўных педагагічных тэхналогій, якія спрыяюць развіццю крытычнага мыслення, вопыту фарміравання і выкарыстання інструментарыя вучэбна-даследчай дзейнасці, ролевага і імітацыйнага мадэлявання, магчымасці творча засвойваць новы вопыт, вылучаюцца тэхналогіі: праблемнага навучання; развіцця крытычнага мыслення; праектнага навучання; камунікацыйныя і інфармацыйныя тэхналогіі; тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці; метад аналізу канкрэтных сітуацый; іншыя інавацыйныя і інтэрактыўныя методыкі.

Пры арганізацыі выкладання вучэбнай дысцыпліны «Ахова гісторыка-культурнай спадчыны» выкарыстоўваюцца наступныя формы вучэбнай дзейнасці : аўдыторная, пазааўдыторная, групавая, індывідуальная.

Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі самастойнай работы студэнтаў

У мэтах павышэння эфектыўнасці засваення вучэбнага матэрыялу па вучэбнай дысцыпліне «Ахова гісторыка-культурнай спадчыны» і фарміравання прафесійных кампетэнцый вучэбным планам спецыяльнасці прадугледжана самастойная работа студэнтаў, якая накіравана на актывізацыю вучэбна-пазнавальнай дзейнасці студэнтаў; фарміраванне ў іх уменняў і навыкаў самастойнага выкарыстання атрыманых тэарэтычных ведаў на практыцы; самаразвіццё і самаўдасканаленне.

Самастойная работа дапамагае на працягу ўсяго перыяду вывучэння вучэбнай дысцыпліны арганізаваць сваечасовае выкананне заданняў студэнтамі, сачыць за індывідуальным рэйтынгам кожнага студэнта.

Самастойная работа студэнтаў садзейнічае развіццю самастойных даследчых навыкаў пошука неабходнай інфармацыі ў навуковай, навукова-метадычнай літаратуры, інтэрнэт-крыніцах, выкарыстанню кантэнт-аналізу крыніц, прысвечаных актуальным праблемам аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае

падрыхтоўку інфармацыйных матэрыялаў – дакладаў, рэфератаў і мультымедыя прэзентацый, індывідуальных даследчых работ, творчых заданняў, выконваемых у малых групах па актуальных пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны краіны.

Выкладчык знаёміць студэнтаў са спецыфікай выканання самастойнай работы і спосабамі яе кантролю на ўводнай лекцыі па вучэбнай дысцыпліне. Кантроль за выкананнем самастойнай работы з'яўляецца бягучым і рэалізуецца праз электронную пошту, індывідуальныя кансультацыі падчас семінарскіх заняткаў.

Дыягностыка сфарміраванасці кампетэнцый студэнта

Патрабаванні да ажыццяўлення дыягностыкі.

Працэдура дыягностыкі сфарміраванасці кампетэнцый студэнта ўключае наступныя этапы:

– вызначэнне аб'екта дыягностыкі;

– выяўленне факта вучэбных дасягненняў студэнта з дапамогай крытэрыяльна-арыентаваных тэстаў і іншых сродкаў дыягностыкі;

– вымярэнне ступені адпаведнасці вучэбных дасягненняў студэнта патрабаванням адукацыйнага стандарта;

– ацэньванне вынікаў выяўлення і вымярэння адпаведнасці вучэбных дасягненняў студэнта патрабаванням адукацыйнага стандарта (з дапамогай шкалы ацэнак).

Рэкамендуемыя сродкі дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Бягучы кантроль ажыццяўляецца шляхам ацэнкі ведаў і актыўнасці студэнтаў на семінарскіх занятках у форме вусных адказаў, калоквіумаў, тэставых заданняў, падрыхтоўкі рэфератаў і мультымедыя прэзентацый, а таксама з улікам узроўня выканання кіруемай самастойнай работы – індывідуальных і групавых праектаў.Выкананне заданняў з'яўляецца абавязковым для ўсіх студэнтаў.

Асноўным сродкам засваення ведаў і авалодання неабходнымі кампетэнцыямі з'яўляецца праверка ведаў рознага тыпу (рэпрадуктыўных, рэканструктыўных, варыятыўных), у межах гадзін, якія прадугледжаны для семінарскіх заняткаў.

Для дыягностыкі адпаведнасці вучэбных дасягненняў студэнтаў патрабаванням адукацыйнага стандарта рэкамендуецца выкарыстоўваць праблемныя заданні, якія прадугледжваюць эўрыстычную дзейнасць і нефармалізаваны адказ.